Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Прарэктар па навуковай рабоце
БДУКіМ
__________ В.Р. Языковіч
«19» чэрвеня 2019 г.
Рэгістрацыйны № ВД-108 / Э вуч.

# АРГАНІЗАЦЫЯ ЭКСКУРСІЙНАГА АБСЛУГОЎВАННЯ Ў СФЕРЫ КУЛЬТУРНАГА ТУРЫЗМУ

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі*
*па спецыяльнасці II ступені вышэйшай адукацыі*
*1-23 80 02Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны*
*Прафілізацыя: Культурная спадчына і музеялогія*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2019

Вучэбная праграма складзена на аснове тыпавога вучэбнага плана па спецыяльнасці II ступені вышэйшай адукацыі 1-23 80 02 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны. Рэг. № Е23-2-002/ пр-тып. ад 21.03.2019

**СКЛАДАЛЬНІК:**

*І.Г. Лупашка,* дацэнт кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат культуралогіі

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

*Я.Л. Іванова,* намеснік дырэктара па лічбавых тэхналогіях і сувязях з грамадскасцю дзяржаўнай установы «Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь», кандыдат культуралогіі;

*С.А. Пацыенка,* дацэнт кафедры менеджмента сацыяльна-культурнай дзейнасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат культуралогіі

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

*Кафедрай* гісторыі Беларусі і музеязнаўства ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»
(пратакол № 12 ад 31.05. 2019 г.);

*Прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»
(пратакол № 5 ад 12 чэрвеня 2019 г.).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

У сучасных умовах значная ўвага надаецца развіццю турыстычнай сферы, у тым ліку культурна-пазнавальнага турызму. Адным з асноўных складнікаў культурна-пазнавальнага турызму з’яўляецца экскурсія. Гэтым абумоўлена вялікая запатрабаванасць у спецыялістах у сферы экскурсійнага менеджменту (арганізацыя экскурсій) і прафесійных экскурсаводах. Такія абставіны робяць вучэбную дысцыпліну «Арганізацыя экскурсійнага абслугоўвання ў сферы культурнага турызму» надзвычай актуальнай і важнай у працэсе падрыхтоўкі спецыялістаў у галіне музейнай справы.

*Мэтай* вывучэння вучэбнай дысцыпліны «Арганізацыя экскурсійнага абслугоўвання ў сферы культурнага турызму» з’яўляецца азнаямленне з гісторыяй, тэорыяй і практыкай у сферы арганізацыі экскурсійнага абслугоўвання, а таксама фарміраванне ведаў і практычных навыкаў, неабходных для арганізацыі, распрацоўкі і правядзення экскурсій.

У адпаведнасці з мэтай вызначаны наступныя *задачы*:

– азнаямленне магістрантаў з асноўнымі палажэннямі гісторыі і тэорыі ў сферы арганізацыі экскскурсій і экскурсійнай работы;

– фарміраванне дакладнага ўяўлення аб методыцы арганізацыі і правядзення экскурсій у сферы культурнага турызму;

– фарміраванне прафесійных навыкаў менеджера па арганізацыі экскурсій.

Зместам вучэбнай дысцыпліны «Арганізацыя экскурсійнага абслугоўвання ў сферы культурнага турызму» прадугледжана фарміраванне наступных кампетэнцый у адпаведнасці з тыпавым вучэбным планам па спецыяльнасці II ступені 1-23 80 02 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны:

Вучэбныя кампетэнцыі:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– ВК-4. Быць здольным ажыццяўляць эфектыўную камунікацыю ў розных формах (прафесійная, дзелавая, навуковая і інш.) для дасягнення сацыяльна-значных вынікаў.

Спецыяльныя кампетэнцыі:

– СК-6. Валодаць інавацыйнымі тэхналогіямі ў арганізацыі экскурсійнага абслугоўвання ў турызме.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны магістранты павінны

*ведаць:*

– асноўныя этапы развіцця экскурсійнай справы ў Беларусі;

– сучасны стан і перспектывы развіцця экскурсійнага турызму ў Беларусі;

– сучасныя кірункі ў тэматыцы экскурсій;

– асноўныя метадалагічныя падыходы ў сучаснай экскурсійнай справе;

– асноўныя віды экскурсійных аб’ектаў у сферы культурна-пазнавальнага турызму.

*умець:*

– аргументаваць стварэнне новых экскурсійных прадуктаў;

– распрацоўваць экскурсіі і экскурсійныя праграма разнастайнай тэматыкі;

– на высокім узроўні арганізоўваць і праводзіць экскурсіі для розных катэгорый экскурсантаў;

– выбіраць эфектыўныя методыкі правядзення экскурсій;

– выбіраць аптымальныя экскурсійныя аб’екты пры падрыхтоўцы розных тыпаў экскурсій.

Для больш глыбокага засваення матэрыялу, акрамя аўдыторных заняткаў, у якасці самастойнай работы прадугледжваецца наведванне магістрантамі музейных і па-за музейных экскурсій, прагляд і аналіз мультымедыйных матэрыялаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Пры вывучэнні вучэбнай дысцыпліны «Арганізацыя экскурсійнага абслугоўвання ў сферы культурнага турызму» выкарыстоўваюцца сучасныя метады навучання і камп’ютарныя тэхналогіі.

У адпаведнасці з вучэбным планам на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Арганізацыя экскурсійнага абслугоўвання ў сферы культурнага турызму» прадугледжана 90 гадзін, з якіх – 28 гадзін – аўдыторныя заняткі. Прыкладнае размеркаванне аўдыторных гадзін па відах заняткаў: лекцыі – 20 гадзін, семінары – 8 гадзін. Рэкамендаваная форма кантролю ведаў – залік.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

*Уводзіны*

Мэта, задачы і змест вучэбнай дысцыпліны «Арганізацыя экскурсійнага абслугоўвання ў сферы культурнага турызму». Агляд літаратуры па вучэбнай дысцыпліне.

Асноўныя паняцці: «культурна-пазнавальны (экскурсійны) турызм», «экскурсія», «экскурсант», «турыст», «арганізацыя экскурсійнай дзейнасці». Розныя падыходы да вызначэння экскурсіі. Асноўныя функцыі экскурсіі. Класіфікацыя экскурсій. Роля экскурсіі ў культурна-пазнавальным турызме.

### Раздзел I Гісторыя развіцця і сучасны стан экскурсійнай работы ў Рэспубліцы Беларусь

*Тэма 1 Асноўныя этапы развіцця экскурсійнай справы ў Беларусі*

Першае апісанне падарожжа па Беларусі ў часопісе «Современник» (1853–1856 гг.) П.Шпілеўскага. Іншыя працы П.Шпілеўскага. Публікацыі М. Каяловіча, І.Гарбачэўскага, А. Сапунова, К. Случэўскага.

Першыя арганізаваныя паездкі па Беларусі настаўнікаў і вучняў Віцебскіх гімназій (1860-я гг.).

Заснаванне і дзейнасць Цэнтральнага бюро краязнаўства (1924). Пачатак масавага турыстычнага руху ў к. 1920-х гг. Стварэнне ў Мінску Аргбюро Беларускага таварыства пралетарскага турызму і экскурсій (1931). Стварэнне раённых бюро ў Віцебску, Бабруйску, Оршы, Жлобіне. Стварэнне Дзіцячай турыстычнай станцыі (1936).

Беларускія выданні, прысвечаныя турызму: «Экскурсия на завод» (1931), «На беларускіх прасторах», «Турысты - за вывучэнне гісторыі Грамадзянскай вайны» (1932) і інш.

Аднаўленне экскурсійна-турыстычнай дзейнасці пасля Вав. Стварэнне Рэспубліканскай дзіцячай экскурсійна-турысцкай станцыі (1946) і абласных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

станцый у Магілёве (1946), Віцебску (1951), Гродне (1951), Брэсце (1953), Гомелі (1957).

Стварэнне і дзейнасць Мінскай экскурсійнай базы Цэнтральнага турысцка-экскурсійнага ўпраўлення УЦСПС (1951). Распрацоўка экскурсій супрацоўнікамі Мінскай экскурсійнай базы. Адкрыццё экскурсійных бюро ў гарадах Беларусі (Магілеў, Гродна, Гомель, Віцебск, Баранавічы, Барысаў, Салігорск). Рэарганізацыя Мінскай экскурсійнай базы ў Мінскае бюро падарожжаў і экскурсій. Стварэнне аналагічных падраздзяленняў у іншых гарадах.

Пашырэнне геаграфіі падарожжаў. Пачатак падрыхтоўкі кадраў з вышэйшай адукацыяй у сферы турысцка-экскурсійнай справы (к.1960-х-пач.1970-х). Дзейнасць прадпрыемстваў «Беларустурыст» (унутранны турызм і абслугоўванне прафсаюзаў), «Белінтурыст» (прыём замежных грамадзян і адпраўка беларусаў у замежжа), «Спадарожнік» (прыём і адпраўка груп моладзі).

Прынясце дакументаў у галіне развіцця турызма. «Схема размяшчэння і развіцця сеткі турызма ў БССР» (1974), «Схема развіцця турызма ў БССР» (1983). Арганізацыя падрыхтоўкі і павышэння арганізацыі экскурсаводаў пры Бюро падарожжаў і экскурсій.

Крызіс турысцка-экскурсійнай справы ў сяр. 1980-х – пач.1990-х гг. Значнае змяншэнне кскурсійных прапаноў, скарачэнне колькасці метадыстаў і экскурсаводаў.

Адраджэнне экскурсійнай справы. Закон РБ «Аб турызме» (1999). Значны ўздым экскурсійнай справы ў 2000-х гг. Стварэнне Нацыянальнага агенцтва па турызму (2011). Першы з’езд экскурсаводаў і гідаў-перакладчыкаў (2012).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма 2 Сучасны стан экскурсійнай работы ў Беларусі*

Дзяржаўная ўвага да сферы турызму. Нарматыўна-прававое забяспячэнне культурна-пазнавальнага турызму ў Рэспубліцы Беларусь. Заканадаўчыя акты. Дзяржаўная праграма па развіццю турызма на 2011–2015 гг. Дзяржаўная праграма «Замкі Беларусі». Дзяржаўная праграма «Беларусь гасцінная»на 2016–2020 гг. Дзейнасць грамадска-кансультацыйнага савета па развіццю турызму. Пашырэнне колькасці турысцка-экскурсійных маршрутаў па Беларусі.

Праблемы ў сферы культурнага (экскурсійнага) турызма. Праблемы развіцця інфраструктуры, матэрыяльна-тэхнічнай базы. Спрашчэнне безвізавага рэжыму. Стан і развіццё турыстычных аб’ектаў. Праблемы ўзаемадзеення дзяржаўных, грамадскіх і камерцыйных структур па развіццю культурна-пазнавальнага турызму.

*Тэма 3 Сістэма падрыхтоўкі кадраў у сферы культурнага турызма*

Падрыхтоўка і павышэнне кваліфікацыі кадраў у сферы культурнага турызма. Падрыхтоўка кадраў у БДУ, БДУКМ, БДУФК і інш. вучэбных установах. Прафесійная атэстацыя экскурсаводаў і гідаў-перакладчыкаў на базе ДУ «Нацыянальнае агенцтва па турызму». Нацыянальны рэеестр экскурсаводаў і гідаў-перакладчыкаў. Інфармацыйна-метадычнае забеспячэнне дзейнасці ў сферы культурнага турызма як адзін з кірункаў дзейнасці Нацыянальнага агенцтва па турызму.

Кваліфікацыйныя характарыстыкі спецыялістаў: экскурсавод, гід-перакладчык, культуролаг-аніматар, кіраўнік турыстычнай групы.

Беларускае грамадскае аб’яднанне экскурсаводаў і гідаў перакладчыкаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Раздзел II Сучасныя падыходы і перспектывы развіцця культурна-пазнавальнага турызму ў Беларусі

### *Тэма 4 Сучасныя кірункі ў развіцці культурнага турызма*

Турыстычны патэнцыял Беларусі ў сферы культурна-пазнавальнага (экскурсійнага) турызму. Эфектыўнае выкарыстанне і папулярызацыя гісторыка-культурнай спадчыны ў экскурсіях па Беларусі. Сучасныя кірункі ў тэматыцы экскурсій (ваенна-гістарычныя экскурсіі, «замкавы»турызм, гарадскія экскурсіі, прамысловыя экскурсіі, аўтарскія экскурсіі і інш). Музейная экскурсія як складнік экскурсійнай праграмы тура па Беларусі. Новыя экскурсійныя аб’екты Беларусі.

Новыя тэндэнцыі і метадалагічныя падыходы ў сучаснай экскурсійнай справе. Экскурсіі-анімацыі, тэатралізаваныя экскурсіі, квэст-экскурсіі, экскурсіі на веласіпедах, сегвеях, роліках і інш. Анімацыйныя праграмы турыстычных кампаній «Святовит», «Колесо путешествий», фонда «Краіна замкаў»і інш. Роля экскурсавода і гіда-перакладчыка ў рэалізацыі новых форм экскурсійнага прадукта.

Фэст экскурсаводаў і яго дзейнасць па папулярызацыі гісторыі сваёй «малой радзімы».

### *Тэма 5 Асновы экскурсійнага менеджмента*

Арганізацыя і кіраванне экскурсійнай дзейнасцю ў турысцка-экскурсійных прадпрыемствах. Экскурсійнае бюро, яго структура: арганізатары экскурсій, кіраўнікі турысцкіх груп, экскурсаводы (гіды). Арганізацыя работы экскурсавода. Дакументацыя, якая рэгламентуе яго дзейнасць. Змест асноўных дакументаў. Дакументацыя пры рабоце з транспартнымі сродкамі. Справаздачнасць.

Сучасыя тэхналогіі фарміравання і рэкламы экскурсійнага прадукта. Вывучэнне попыту ў галіне экскурсійнага абслугоўвання. Комплексны падыход да стварэння турысцка-экскурсійнага прадукту.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма 6 Экскурсія як паслуга*

Паняцце экскурсійнага абслугоўвання. Экскурсія як паслуга. Якасць і культура абслугоўвання. Асноўныя патрабаванні да экскурсіі: дакладнасць, культурна-пазнавальная значнасць, задавальненне інтарэсаў экскурсантаў. Улік асабістых пераваг турыстаў і экскурсантаў у працэсе экскурсійнага абслугоўвання. Ступень задаволеннасці спажыўцоў экскурсійных паслуг як мера іх якасці.

*Тэма 7 Экскурсійная аўдыторыя. Дыферэнцыраваны падыход да экскурсійнага абслугоўвання*

Экскурсійная аўдыторыя. Класіфікацыя экскурсантаў: фармальныя і псіхалагічныя падыходы. Сутнасць дыферэнцыраванага падыходу да экскурсійнага абслугоўвання. Віды фарміравання экскурсійных груп. Арганізацыя і правядзенне экскурсій з улікам запатрабаванняў, і інтарэсаў экскурсантаў.

Спецыфіка падрыхтоўкі, арганізацыі і правядзення экскурсій для дзяцічай аўдыторыі. Спецыфіка падрыхтоўкі, арганізацыі і правядзення экскурсій для моладзі. Спецыфіка падрыхтоўкі, арганізацыі і правядзення экскурсій для людзей сталага ўзросту.

Асаблівасці арганізацыі і правядзення экскурсій для змешаных груп.

Асаблівасці падрыхтоўкі, арганізацыі і правядзення экскурсій для замежных турыстаў.

Арганізацыя індывідуальнага экскурсійнага абслугоўвання. Арганізацыя і спецыфіка экскурсійнага абслугоўвання для сямейных наведвальнікаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

## (дзённая форма атрымання адукацыі)

| Нумар раздзела, тэмы | Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | Колькасць гадзін КСР | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Семінарскія заняткі | | |
| | Уводзіны | 2 | | | |
| **Раздзел I Гісторыя развіцця і сучасны стан экскурсійнай работы ў Рэспубліцы Беларусь** | | | | | |
| 1. | Асноўныя этапы развіцця экскурсійнай справы ў Беларусі | 4 | | 2 | Выбарачнае апытанне, пісьмовая работа |
| 2. | Сучасны стан экскурсійнай работы ў Беларусі | 2 | 2 | | Дыскусія |
| 3. | Сістэма падрыхтоўкі кадраў у сферы культурнага турызма | 2 | | 2 | Выбарачнае апытанне, падрыхтоўка рэфератаў |
| **Раздзел II Сучасныя падыходы і перспектывы развіцця культурна-пазнавальнага турызму ў Беларусі** | | | | | |
| 4. | Сучасныя кірункі ў развіцці культурнага турызма | 2 | 2 | | Выбарачнае апытанне, падрыхтоўка мультымедыйных прэзентацый |
| 5. | Асновы экскурсійнага менеджмента | 2 | 1 | | Выбарачнае апытанне, падрыхтоўка рэфератаў |
| 6. | Экскурсія як паслуга | 2 | 1 | 2 | Выбарачнае апытанне, тэставае заданне |
| 7. | Экскурсійная аўдыторыя. Дыферэнцыраваны падыход да экскурсійнага абслугоўвання | 4 | 2 | 2 | Выбарачнае апытанне, падрыхтоўка мультымедыйных прэзентацый |
| | **Разам:** | **20** | **8** | **8** | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

**(завочная форма атрымання адукацыі)**

| Нумар раздзела, тэмы | Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | |
|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Семінарскія заняткі |
| | Уводзіны | 1 | |
| 1. | **Раздзел I Гісторыя развіцця і сучасны стан экскурсійнай работы ў Рэспубліцы Беларусь**<br>Асноўныя этапы развіцця экскурсійнай справы ў Беларусі.<br>Сучасны стан экскурсійнай работы ў Беларусі.<br>Сістэма падрыхтоўкі кадраў у сферы культурнага турызма. | 2 | 1 |
| 2. | **Раздзел II Сучасныя падыходы і перспектывы развіцця культурна-пазнавальнага турызму ў Беларусі**<br>Сучасныя кірункі ў развіцці культурнага турызма.<br>Асновы экскурсійнага менеджмента.<br>Экскурсія як паслуга.<br>Экскурсійная аўдыторыя.<br>Дыферэнцыраваны падыход да экскурсійнага абслугоўвання. | 3 | 1 |
| | **Разам:** | **6** | **2** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА
### Літаратура
*Асноўная*


1. Государственная программа «Беларусь гостеприимная» на 2016–2020 годы : утв. постановлением Совета Министров Республики Беларусь 23 марта 2016 г. № 232 // Национальный правовой интернет-портал Республики Беларусь [Электронный ресурс]. – Минск, 2003 – 2017. – Режим доступа : http://pravo.by/document/?guid=3871&p0=C21600232. – Дата доступа : 04.03.2019.

2. Дворниченко, В.В. Организация экскурсионной деятельности : учеб.-практ. пособие для системы высш. и доп. образования / В.В. Дворниченко, Н.В. Савина. – М. : МЭСИ, 2000. – 170 с.

3. Емельянов, Б.В. Организация работы экскурсионного учреждения : учеб. пособие / Б.В.Емельянов ; Центр. совет по туризму и экскурсиям, Экскурс. упр., Ин-т повышения квалификации работников турист.-экскурс. орг. – М. : Центр. рекл.-информ. бюро «Турист», 1987. – 143 с.

4. Емельянов, Б.В. Экскурсоведение : учебник / Б.В. Емельянов. – М. : Сов. спорт, 2004. – 215 с.

5. Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб культуры, 20 ліпен. 2016 г., № 413-З // Нацыянальны прававы інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь [Электронны рэсурс]. – Мінск, 2003 – 2017 . – Рэжым доступу : http://www.pravo.by/document/?guid=12551&p0=Hk1600413&p1=1. – Дата доступу : 04.03.2019.

6. Олюнина, И.В. Современная практика экскурсионной работы в Республике Беларусь : пособие / И.В. Олюнина, Н.В. Суслова. – Минск : БГУ, 2014. – 142 с.

7. О туризме : Закон Респ. Беларусь : принят 25 нояб. 1999 г., № 326-З : с изм. и доп.: текст по состоянию на 18 июля 2016 г. // Национальный правовой интернет-портал Республики Беларусь [Электронный ресурс]. – Минск, 2003 – 2017. – Режим доступа :


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

http://www.pravo.by/document/?guid=3961&p0=H19900326. – Дата доступа : 04.10.2018.

8. Потаева Г.Р. Инновации в экскурсионном (познавательном) туризме // Сборник методических рекомендаций / Нац. агентство по туризму. – Минск, 2007. – С. 265–307.

9. Савина, Н.В. Экскурсоведение : учеб.-практ. пособие / Н.В. Савина. – Минск : БГЭУ, 2007. – 246 с.

10. Сборник методических рекомендаций / Мин-во спорта и туризма Республики Беларусь, Департамент по туризму Мин-ва спорта и туризма Республики Беларусь, Нац. агентство по туризму. – Минск, 2007. – 307 с.

11. Цецохо, С.П. Экскурсоведение / С.П. Цецохо, В.К. Нестерович, Л.В. Скакун. – Минск: БГУФК, 2009. – 103 с.

*Дадатковая*

1. Долженко, Г.П. Экскурсионное дело : учеб. пособие / Г.П. Долженко. – М. ; Ростов-на-Дону : МарТ, 2005. – 271 с.

2. Каменец А.В. Технологии организации культурного туризма / А.В. Каменец, М.С. Кирова. – М. : Мосиздатинвест, 2006. – 128 с.

3. Карчевская, Е.Н. Организация туризма и экскурсионного обслуживания в Республике Беларусь / Е.Н. Карчевская. – Гомель : ГГТУ, 2008. – 58 с.

4. О дифференцированном подходе к экскурсионному обслуживанию : метод. рекомендации / Центр. совет по туризму и экскурсиям ВЦСПС, Гл. экскурс. упр. – М. : Центр. рекл.-информ. бюро «Турист», 1974. – 55 с.

5. Пренц К.В. Развитие культурного туризма в Беларуси : (по материалам науч. конф. и семинаров 2004 г.) // Актуальныя праблемы культуры і мастацтва : навук.-інфарм. зб. / Нац. б-ка Беларусі. – 2004. – Вып. 3/4. – С. 97–108.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

6. Романчук, А.В. Музейный туризм: учебно-методическое пособие / А.В. Романчук. — СанктПетербург, 2010. — 46 с.

7. Седова, Н.А. Культурно-просветительный туризм : учеб. пособие / Н.А.Седова. – М. : Сов. спорт, 2003. – 96 с.

8. Экскурсии в культуру : метод. сборник / под ред. И.М. Гревса. – М. : Мир, 1925. – 204 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Характарыстыка рэкамендуемых метадаў выкладання

Пры арганізацыі выкладання вучэбнай дысцыпліны «Арганізацыя экскурсійнага абслугоўвання ў сферы культурнага турызму» рэкамендуецца выкарыстоўваць традыцыйныя формы і метады навучання: лекцыйныя і семінарскія заняткі, варыятыўныя мадэлі кіруемай самастойнай работы. У практыку правядзення семінарскіх заняткаў мэтазгодна ўкараняць методыкі актыўнага навучання, дыскусійныя метады (групавыя дыскусіі, мадэліраванне практычных сітуацый і інш.), візуальныя метады (метады ілюстрацыі, дэманстрацыі, відэаматэрыял).

У ліку эфектыўных педагагічных тэхналогій, якія спрыяюць развіццю крытычнага мыслення, вопыту фарміравання і выкарыстання інструментарыя вучэбна-даследчай дзейнасці, ролевага і імітацыйнага мадэлявання, магчымасці творча засвойваць новы вопыт, вылучаюцца тэхналогіі: праблемнага навучання; развіцця крытычнага мыслення; праектнага навучання; камунікацыйныя і інфармацыйныя тэхналогіі; тэхналогіі вучэбна-даследчай дзейнасці; метад аналізу канкрэтных сітуацый; іншыя інавацыйныя і інтэрактыўныя методыкі.

## Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі і выкананні самастойнай работы магістрантаў

Арганізацыя самастойнай работы магістрантаў прадугледжвае падрыхтоўку інфармацыйных матэрыялаў на адпаведную тэматыку, мультымедыя прэзентацый па асобных падраздзелах вучэбнай дысцыпліны, вывучэння дадатковых крыніц і літаратуры, падрыхтоўку да заліку і інш.

Самастойная работа магістрантаў накіравана на:

– фарміраванне навыкаў пошуку і аналізу розных відаў інфармацыі;
– засваенне, сістэматызацыю і трансляцыю атрыманых ведаў у будучай прафесійнай дзейнасці;
– развіццё дадатковых навукова-даследчых навыкаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Кантроль за выкананнем самастойнай работы з’яўляецца бягучым і рэалізуецца праз электронную пошту, індывідуальныя кансультацыі, падчас лекцыйных і семінарскіх заняткаў, а таксама падчас правядзення заліка.

## Пералік рэкамендуемых сродкаў дыягностыкі вынікаў вучэбнай дзейнасці магістрантаў

Арганізацыя вучэбнай работы магістрантаў накіравана на засваенне лекцыйнага матэрыялу, а таксама на самастойны пошук, анліз і падрыхтоўку інфармацыйных матэрыялаў да семінарскіх заняткаў па вучэбнай дысцыпліне.

Для дыягностыкі атрыманых магістрантаў ведаў прадугледжваецца выкарыстанне наступных сродкаў:

– тэставыя заданні па асобных падраздзелах і дысцыпліне ўцэлым;

– вуснае апытанне па асобных падраздзелах дысцыпліны;

– пісьмовыя работы па асобных падраздзелах дысцыпліны;

– падрыхтоўка мультымедыйных прэзентацый па асобных падраздзелах дысцыпліны;

– выступленні на семінарскіх занятках па самастойна падрыхтаваных тэмах.

Выніковая ацэнка вынікаў вучэбнай дзейнасці прадугледжвае правядзенне заліку. Адказ на ацэнку роўную 4 балам і вышэй прадугледжвае атрыманне заліку па вучэбнай дысцыпліне.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Крытэрыі ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці**

| Балы | Паказчыкі ацэнкі |
|---|---|
| 1 (адзін) | Адсутнасць ведаў і кампетэнтнасці ў межах дысцыпліны; адмова ад адказу. |
| 2 (два) | Фрагментарныя веды ў рамках дысцыпліны; веды асобных літаратурных крыніц, рэкамендаваных вучэбнай праграмай дысцыпліны; няўменне выкарыстоўваць навуковую тэрміналогію дысцыпліны, наяўнасць у адказе грубых памылак; пасіўнасць на практычных занятках, нізкі ўзровень культуры ў выкананні і афармленні заданняў. |
| 3 (тры) | Недастаткова поўны аб'ём ведаў у рамках дысцыпліны; веданне часткі асноўнай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай дысцыпліны; выкарыстанне навуковай тэрміналогіі, выкладанне адказу на пытанні з істотнымі памылкамі; слабае валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, некампетэнтнасць у вырашэнні стандартных (тыпавых) задач; няўменне арыентавацца ў сутнасці асноўных тэорый, канцэпцый і кірункаў вывучаемай дысцыпліны; пасіўнасць на практычных занятках, нізкі ўзровень культуры ў выкананні і афармленні заданняў. |
| 4 (чатыры) | Мінімальна дастатковы аб'ём ведаў у рамках дысцыпліны; засваенне асноўнай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай дысцыпліны; выкарыстанне навуковай тэрміналогіі, лагічнае выкладанне адказу на пытанні, уменне рабіць высновы без істотных памылак; валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, уменне выкарыстоўваць яго ў вырашэнні стандартных (тыпавых) задач; уменне арыентавацца ў асноўных тэорыях, метадах і кірунках дысцыпліны і даваць ім ацэнку; работа пад кіраўніцтвам выкладчыка на практычных занятках, дапушчальны ўзровень культуры выканання і афармлення заданняў. |
| 5 (пяць) | Дастатковыя веды ў аб'ёме вучэбнай праграмы; выкарыстанне навуковай тэрміналогіі, граматнае, лагічна правільнае выкладанне адказу на пытанні, уменне рабіць высновы; валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, уменне яго выкарыстоўваць у рашэнні вучэбных задач; засваенне асноўнай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай дысцыпліны; уменне арыентавацца ў базавых тэорыях, метадах і кірунках дысцыпліны і даваць ім параўнальную ацэнку; самастойная работа на практычных занятках, фрагментарны ўдзел у групавых абмеркаваннях, дастатковы ўзровень культуры выканання і афармлення заданняў. |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | |
|---|---|
| 6 (шэсць) | Дастаткова поўныя і сістэматызаваныя веды ў аб'ёме вучэбнай праграмы; выкарыстанне неабходнай навуковай тэрміналогіі, граматнае, лагічна правільнае выкладанне адказу на пытанні, уменне рабіць абагульненні і абгрунтаваныя высновы; валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, уменне яго выкарыстоўваць у рашэнні вучэбных задач; засваенне асноўнай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай дысцыпліны; уменне арыентавацца ў базавых тэорыях, метадах і кірунках дысцыпліны і даваць ім параўнальную ацэнку; актыўная самастойная работа на практычных занятках, перыядычны ўдзел у групавых абмеркаваннях, дастаткова высокі ўзровень культуры выканання і афармлення заданняў. |
| 7 (сем) | Сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх раздзелах вучэбнай праграмы; выкарыстанне навуковай тэрміналогіі, граматнае, лагічна правільнае выкладанне адказу на пытанні, уменне рабіць абгрунтаваныя высновы і абагульненні; валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, уменне яго выкарыстоўваць у пастаноўцы і рашэнні навуковых і прафесійных задач; засваенне асноўнай і дадатковай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай дысцыпліны; уменне арыентавацца ў асноўных тэорыях, метадах і кірунках дысцыпліны і даваць ім аналітычную ацэнку; актыўная самастойная работа на практычных занятках, удзел у групавых абмеркаваннях, высокі ўзровень культуры выканання і афармлення заданняў. |
| 8 (восем) | Сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх пастаўленых пытаннях у аб'ёме вучэбнай праграмы; выкарыстанне навуковай тэрміналогіі, граматнае, лагічна правільнае выкладанне адказу на пытанні, уменне рабіць абгрунтаваныя высновы і абагульненні; валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, уменне яго выкарыстоўваць у пастаноўцы і рашэнні навуковых і прафесійных задач; здольнасць самастойна вырашаць складаныя праблемы ў рамках вучэбнай дысцыпліны; засваенне асноўнай і дадатковай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай дысцыпліны; уменне арыентавацца ў тэорыях, метадах і кірунках дысцыпліны і даваць ім аналітычную ацэнку; актыўная самастойная работа на практычных занятках, сістэматычны ўдзел у групавых абмеркаваннях, высокі ўзровень культуры выканання і афармлення заданняў. |
| 9 (дзевяць) | Сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх раздзелах вучэбнай праграмы; дакладнае выкарыстанне навуковай |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | |
|---|---|
| | тэрміналогіі, граматнае, лагічна правільнае выкладанне адказу на пытанні, уменне рабіць абгрунтаваныя высновы і абагульненні; валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, уменне яго выкарыстоўваць у пастаноўцы і рашэнні навуковых і прафесійных задач; здольнасць самастойна і творча вырашаць складаныя праблемы ў нестандартнай сітуацыі ў рамках вучэбнай праграмы; засваенне асноўнай і дадатковай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай дысцыпліны; уменне арыентавацца ў тэорыях, метадах і кірунках дысцыпліны і даваць ім аналітычную ацэнку; актыўная сістэматычная самастойная работа на практычных занятках, творчы ўдзел у групавых абмеркаваннях, высокі ўзровень культуры выканання і афармлення заданняў. |
| 10 (дзесяць) | Сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх раздзелах вучэбнай праграмы, а таксама па асноўных пытаннях па-за яе межамі; дакладнае выкарыстанне навуковай тэрміналогіі, граматнае, лагічна правільнае выкладанне адказу на пытанні, уменне рабіць абгрунтаваныя высновы і абагульненні; бездакорнае валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, уменне эфектыўна яго выкарыстоўваць у пастаноўцы і рашэнні навуковых і прафесійных задач; здольнасць самастойна і творча вырашаць складаныя праблемы ў нестандартнай сітуацыі ў рамках вучэбнай праграмы; поўнае і глыбокае засваенне асноўнай і дадатковай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай дысцыпліны; уменне свабодна арыентавацца ў тэорыях, метадах і кірунках дысцыпліны і даваць ім аналітычную ацэнку, выкарыстоўваць навуковыя дасягненні іншых дысцыплін; самастойная творчая работа на практычных занятках, актыўны творчы ўдзел у групавых абмеркаваннях, высокі ўзровень культуры выканання і афармлення заданняў. |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ